# МАСТАЦТВА КНІГІ — ДЗЕЦЯМ І ДАРОСЛЫМ

## У Мінску выбралі найлепшыя кнігі, сярод якіх ілюстраваныя выданні для самых маленькіх і праекты выдавецкага дома «Звязда»



Факсімільнае выданне Полацкага Евангелля канца XII ст. выдавецтва Беларускага Экзархата.

Фота БЕЛТА.

**У Мінску прайшло традыцыйнае ўзнагароджанне найлепшых кніг. Іх вызначылі ў межах 53-га Нацыянальнага конкурсу «Мастацтва кнігі», які ладзіцца з 1960-га года і падводзіць вынікі працы айчынных кнігавыдаўцоў. Узнагароджанне адбылося ў малой зале Палаца рэспублікі ў рамках XXI Міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу. Гэтым разам у конкурсе «Мастацтва кнігі» ўзяло ўдзел 31 выдавецтва, 134 выданні павышанай якасці.**

Гран-пры конкурсу (намінацыя «Трыумф») атрымала факсімільнае выданне Полацкага Евангелля канца XII ст. выдавецтва Беларускага Экзархата.

Асаблівую ўвагу заўсёды прыцягваюць пераможцы ў намінацыі «ЛІТ-фармат». Гэта выданні літаратурна-мастацкага кірунку. Сёлета найлепшымі сталі серыі кніг «Маладзік» і «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» выдавецтва «Мастацкая літаратура». А вось пераможцамі ў намінацыі «Разам з кнігай мы расцём» стала серыя гэтага ж выдавецтва «Нашым дзеткам», у якой выйшлі, напрыклад, кнігі Рыгора Барадуліна («Сябрыня») і Раісы Баравіковай («Ты не слухай Мішку, коцік»). Гэта новая, даволі эксперыментальная серыя: тонкія кніжкі, праілюстраваныя маладымі мастакамі. Глядзяцца яны, трэба адзначыць, даволі годна.

Фотаальбом «Мінск. Сэрца Беларусі» выдавецтва «Беларусь» стаў пераможцам у намінацыі «Фотапогляд». А найлепшымі ў намінацыі «АРТ-кніга» (выданні па выяўленчым мастацтве, факсімільныя, рэпрынтныя, бібліяфільскія выданні) сталі кнігі Уладзіміра Сцяпана «Настаўнік Сяргей Пятровіч Каткоў» і альбом рэпрадукцый мастака Сяржука Цімохава, якія пабачылі свет у выдавецкім доме «Звязда».

У намінацыі «Эўрыка», якую атрымліваюць навуковыя і навукова-папулярныя выданні, перамагла кніга Вольгі Лабачэўскай «Беларускі народны тэкстыль: мастацкія асновы, узаемасувязі, навацыі» (выдавецкі дом «Беларуская навука»). У намінацыі «Падручнік новага веку» пераможнай стала серыя вучэбных выданняў выдавецтва «Аверсэў».

Лаўрэаты конкурсу «Мастацтва кнігі».



Фота Надзеі БУЖАН.

А вось у намінацыі «Духоўнасць» адзначылі кнігу «Кніжная культура. Ветка» выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі».

СТАР. 2

# МАСТАЦТВА КНІГІ — ДЗЕЦЯМ І ДАРОСЛЫМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Выдавецтва «Кніжны дом» адзначана ў намінацыі «За ўклад у нацыянальнае кнігавыданне» — за выданне высакаякаснай, багата ілюстраванай фундаментальнай даведачнай, навучальнай, навуковай, навукова-папулярнай, дзіцячай і літаратурна-мастацкай літаратуры («Найноўшы філасофскі слоўнік», «Постмадэрнізм», «Гісторыя філасофіі», «Рэлігія», «Псіхалогія», «Фізіятэрапія», «Лекавыя расліны», «Эканоміка», «Рэлігіі свету», серыі «У дапамогу школьніку», «Рэпетытар», «Школьны курс»).

Гэтым разам у рамках «Мастацтва кнігі» было вырашана ўзнагародзіць выданні ў трох спецыяльных намінацыях. Так, у намінацыі «За ўклад у захаванне духоўнай спадчыны» ўзнагародзілі выдавецтва «Беларусь» за кнігу «Слуцкія паясы. Адраджэнне традыцый» мастацтвазнаўца Барыса Лазукі. Аўтару таксама ўручылі спецыяльны дыплом і памятны знак-сімвал за навуковую даследчую работы ў справе аднаўлення страчаных культурных каштоўнасцяў. Серыя з дванаццаці кніг «Сугучча сэрцаў» выдавецкага дома «Звязда» стала лаўрэатам спецнамінацыі «Садружнасць». А заказныя кнігі «Старонкі гісторыі пажарнай службы Беларусі» і «Жабінкаўскі цукровы завод. 50 гадоў (1963—2013)» (навукова-вытворчая кампанія «Тэхналогія») прызнаны лепшымі ў намінацыі «У люстэрку часу».

За высакаякасны дызайн серый кніг «Маладзік» і «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» спецыяльным дыпломам і памятнымі знакамі-сімваламі ўзнагародзілі Уладзіміра Лукашыка. Аляксандру Сувораву адзначылі за творчы падыход да канцэпцыі заказных кніг (выдавецтва «Паліграфіка»), Святлану Лявонцьеву і Галіну Нячаеву — за даследчую працу ў справе захавання старадрукаваных і рукапісных кніг, аднаўленне страчаных каштоўнасцяў.

Найлепшым ілюстратарам (персанальная намінацыя «Майстэрства») прызналі Варвару Калеснікаву за малюнкі да кнігі Настассі Філіпавай «Плюшавыя казкі», а найлепшым дызайнерам — Аляксандра Царова за арыгінальны дызайн навучальных кніг выдавецтва «Аверсэв», а таксама міжвыдавецкай серыі «Школьная бібліятэка», шматтомных збораў твораў выдавецтва «Мастацкая літаратура». Анатоль Дрыбас прызнаны найлепшым фотамастаком за аўтарскія фотаздымкі альбомаў «Мірскі замак», «Кніжная культура. Ветка», «Полацк 1150» ды іншыя.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**